# УЧАСТНИКИ ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ

*Нашы юбіляры* Гом. праўда, 1984, 20 кастрычніка

# ДОБЛЕСНЫ КАМАНДАРМ



Сёння віднаму савецкаму военачальніку, Маршалу авіяцыі, прафесару, ганаровому грамадзяніну горада Гомеля Сяргею Ігнатавічу Рудэнку спаўняецца 80 гадоў. За яго плячамі — вялікае, цікавае, мужнае жыццё. Для нас, гамяльчан, гэты палымяны патрыёт Радзімы — асабліва блізкі чалавек, з імем якога звязана вызваленне нашага горада і вобласці ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у дні Вялікай Айчыннай вайны.

Біяграфія С. І. Рудэнкі — гэта «звычайная біяграфія ў незвычайны час». Нарадзіўся ён 20 кастрычніка 1904 года ў гарадскім пасёлку Корап Чарнігаўскай вобласці ў сям'і шаўца-саматужніка. Першыя яго працоўныя крокі — вучань шаўца. А з 1923 года лёс звязаў Сяргея з Чырвонай Арміяй. Па пуцёўцы камсамола ён паступіў у Качынскае лётнае вучылішча, якое закончыў у 1927 годзе, стаў ваенным пілотам. Але на гэтым вучоба яго не закончылася. Працавіты і дапытлівы юнак імкнуўся авалодаць вяршынямі выбранай ім прафесіі: закончыў камандны і аператыўны факультэты Ваенна-паветранай акадэміі імя Жукоўскага (1932 і 1936 гг.). З першага і да апошняга дня барацьбы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі С. І. Рудэнка — на Заходнім, Калінінскім, Бранскім, Волхаўскім, Данскім, Сталінградскім, Цэнтральным, Беларускім, 1-м Беларускім франтах.

У бітве пад Масквой С. І. Рудэнка камандаваў авіяцыйнай дывізіяй, якая паспяхова выканала баявыя заданні, і Сяргею Ігнатавічу было прысвоена званне генерал-маёра авіяцыі.

З 1942 года ён — камандуючы 16-й Паветранай арміяй. На гэтым пасту асабліва ярка праявіўся яго палкаводчы талент. Лётчыкі ўзначальваемай ім арміі герaічна змагаліся пад Сталінградам і на Курскай дузе, у Беларусі, актыўна ўдзельнічалі ў Вісла-Одэрскай і Берлінскай баявых аперацыях. У саставе войск Беларускага фронту яны ўнеслі вялікі ўклад у вызваленне Гомеля і вобласці ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. І ўдзячныя нашы землякі назвалі С. І. Рудэнку ганаровым грамадзянінам горада Гомеля.

За ўзорнае выкананне баявых заданняў і праяўленыя пры гэтым мужнасць і адвагу 200-м лётчыкам і іншым авіятарам гэтай арміі было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Такога ж гонару ў жніўні 1944 года быў удастоены і сам камандарм.

Пасля вайны С. І. Рудэнка займаў адказныя камандныя пасады: быў начальнікам Галоўнага штаба ВПС, намеснікам Галоўнакамандуючага ВПС, першым намеснікам Галоўнакамандуючага ВПС, начальнікам Ваенна-Паветранай Акадэміі імя Ю. А. Гагарына. У 1955 годзе яму было прысвоена званне Маршала авіяцыі.

З 1973 года Сяргей Ігнатавіч Рудэнка — адказны работнік Міністэрства абароны СССР. На XXII з'ездзе КПСС ён быў выбран кандыдатам у члены ЦК КПСС. З'яўляўся дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР і Вярхоўнага Савета РСФСР.

С. І. Рудэнка ўзнагароджаны 5 ордэнамі Леніна, 8 іншымі ордэнамі, медалямі, а таксама ордэнамі 7 замежных краін.

Мне пашчасціла ў розныя гады сустракацца і гутарыць з Сяргеем Ігнатавічам, надзвычай простым, сціплым і абаяльным чалавекам. Асабліва памятаецца 1946 год, калі ў краіне праходзілі першыя пасляваенныя выбары ў Вярхоўны Савет СССР. Ад савецкіх воінаў, якія неслі нялёгкую службу за рубяжом, кандыдатам у дэпутаты быў вылучан праслаўлены герой Вялікай Айчыннай вайны генерал-палкоўнік авіяцыі С. І. Рудэнка. Мяне назначылі яго даверанай асобай. Добра памятаю словы, сказаныя ім на сустрэчы з воінамі-выбаршчыкамі:

«Беззапаветнае служэнне партыі Леніна, свайму народу, вернасць вялікім ідэалам камунізму было, ёсць і будзе галоўным зместам і сэнсам майго жыцця».

Пражытыя ім гады — яркае пацвярджэнне гэтых слоў. І сёння мы, гамяльчане, сардэчна віншуем Сяргея Ігнатавіча з памятнай датай у яго жыцці, жадаем добрага здароўя, многа-многа светлых і радасных дзён.

**М. ЦАРКОЎ,**
**старшы навуковы супрацоўнік абласнога краязнаўчага музея.**